Аўторак, 08 Верасень 2020

У Полацку судзяць за прагулкі па горадзе

Друкаваць (/news/sud/item/3736-u-polatsku-sudzyats-za-pragulki-pa-goradze?tmpl=component&print=1) | Эл. пошта (/component/mailto/?tmpl=component&template=lt_news&link=8f8b9c1f1d69fc6fc47ac6553844d06385a9f860)

Ацаніць гэты матэрыял (2 галасоў)



(/media/k2/items/cache/3616316bf9087433e85531d71a0fe227_XL.jpg)

Генадзь Бердзянёў

Суд Полацкага раёну і гораду Полацку 8 верасня прысудзіў штраф у памеры 5 базавых велічынь Генадзю Бердзянёву. Гэтак палачаніна пакаралі за ўдзел у шэсці па горадзе 30 жніўня. Напярэдадні былі пакараныя яшчэ двое ўдзельнікаў гэтага шэсця.

Суд над **Генадзем Бердзянёвым** адбыўся ў самай вялікай зале Полацкага суду. Суддзя **Уладзімір Бясецкі**, які зараз выконвае абавязкі старшыні Полацкага суду, аштрафаваў палачаніна на 135 рублёў (5 базавых велічынь).

Бердзянёў не адмаўляўся ад таго, што ўдзельнічаў у шэсці з накінутым на плячах бел-чырвона-белым сцягам і выкрыкваў лозунг «Жыве Беларусь!» Але сваёй віны ў парушэнні заканадаўства аб масавых мерапрыемствах (арт. 23.34 КаАП) не прызнаў. Заявіў, што ягоныя дзеянні не парушалі асноўнага Закону краіны – Канстытуцыі.

Пратакол на актывіста склаў капітан міліцыі **Віктар Кураш**, які на судзе прызнаўся, што ў райаддзеле міліцыі выяўляюць усіх удзельнікаў шэсця па Полацку 30 жніўня – для прыцягнення іх да адказнасці.

Генадзь Бердзянёў прыйшоў на суд з пакетам неабходных рэчаў для адседкі, бо быў гатовы да арышту. Раней яго прэвентыўна затрымлівалі 8 жніўня і выпусцілі толькі 14 жніўня.

Стала вядома, што 5 верасня затрымалі яшчэ двух удзельнікаў шэсця, якіх у панядзелак асудзілі ў РАУС: аднаго пакаралі штрафам у памеры 3 базавыя велічыні, другога – адміністрацыйным арыштам на 3 сутак, якія абвінавачаны ўжо адседзеў па факце.

Аляксандр Марозаў

Апублікавана ў Суд (/news/sud)

Тэгі: Полацак (/itemlist/tag/Полацак) Генадзь Бердзянёў (/itemlist/tag/Генадзь%20Бердзянёў)

Яшчэ ў гэтым разьдзеле: « За фотасэсію на фоне аддзяленьня міліцыі – 540 рублёў штрафу (/news/sud/item/3734-za-fotasesiyu-na-fone) У Віцебску судзілі анколага, музыку і спецназаўца. Працэсы 15 верасня » (/news/sud/item/3740-u-vitsebsku-sudzili)

Вярнуцца ў пачатак (/news/sud/item/3736-u-polatsku-sudzyats-za-pragulki-pa-goradze#startOfPageId3736)

© 2011 - 2023 Віцебская вясна (/). Пры выкарыстаньні матэрыялаў абавязковая гіпэрспасылка. Email: vitebskspring@proton.me (mailto:vitebskspring@proton.me)

(Https(/)